# 15 сакавіка адзначаецца Дзень спажыўца

Штогод 15 сакавіка ў Беларусі адзначаецца Дзень спажыўца. У 2018 годзе ён пройдзе пад дэвізам «Зробім лічбавыя рынкі справядлівымі і сумленнымі». Гэтая тэма падтрымана Кансультатыўным саветам па абароне правоў спажыўцоў дзяржаў - удзельніц СНД для правядзення Дня спажыўца ў краінах СНД.

Лічбавыя тэхналогіі ўсё больш актыўна ўваходзяць у наша жыццё, змяняючы характар многіх паслуг і прадуктаў. Ужо звыклымі для грамадзян сталі паслугі па забеспячэнню онлайн-аплаты пакупкі тавараў, паслуг ЖКП, мабільнай сувязі, Інтэрнэту і інш. У сувязі з гэтым асаблівую ўвагу неабходна надаваць забеспячэнню захавання правоў спажыўцоў на свабоду выбару тавару і на атрыманне поўнай, дакладнай інфармацыі аб таварах, работах , паслугах, а таксама пра выканаўцаў, прадаўцах, вытворцах і пастаўшчыках ў мэтах прыняцця спажыўцамі абгрунтаваных рашэнняў адносна набыцця тавараў (работ, паслуг).
Давер і бяспека спажыўцоў – заклад поспеху лічбавай эканомікі.

Штогод у рамках Дня спажыўца арганізуюцца розныя мерапрыемствы: гарачыя тэлефонныя лініі па пытаннях спажывецкай тэматыкі, прэс-канферэнцыі, круглыя сталы.

15 сакавіка 2018 года ў арганзацыях Мінсувязі таксама адбудуцца тэматычныя мерапрыемствы. РУП «Белпошта» арганізуе ў гэты дзень **з 12.00 да 13.00 кансультатыўную тэлефонную гадзіну** па нумары: **8-017-226-07-79**.З мжтай паляпшэння якасці абслугоўвання спажыўцоў, павышэння даступнасці даведачна-інфармацыйных паслугРУП «Белпошта» укараняе новы сэрвіс Call-цэнтра 154 **– кансультаванне кліентаў у сацыяльных сетках** Зараз аператыўныя адказы на пытанні, якія вас цікавяць, магчыма атрымаць у суполках РУП «Белпошта» у сацыяльных сетках. РУП «Белтэлекам» правядзе **з 10.00 да 12.00 онлайн-кансультацыю** у сацыяльных сетках. Кліенты змогуць задаць свае пытанні пра паслугі «Белтэлекам» і атрымаць адказы спецыялістаў.

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/14-03-2018-2850*